Трыльёны на дарогах не валяюцца на стр. 2

Як участковы адвучыў Лёніка піць на дармаўшчыну на стр. 3

Новая версія: крыж Ефрасінні Полацкай трэба шукаць у Расіі на стр. 5



Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Выходзіць з 1997 года.

№ 19 (48). Слонім. 8 — 14 траўня 1998 г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік Кошт свабодны

9 ТРАЎНЯ — ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ СА СВЯТАМ ВАС, ДАРАГІЯ ВЕТЭРАНЫ!



53-ыя ўгодкі з дня Перамогі над фашысцкай Германіяй святкуе Слонімшчына. У гэты дзень па традыцыі нашы ветэраны надзенуць свае баявыя ўзнагароды, успомняць франтавых сяброў, якіх ужо няма сярод нас.

А яшчэ каля 30-ці гадоў назад яны цвёрда крочылі па бруку цэнтральных вуліцаў у святочнай калоне. Вось так, як на гэтым здымку ўнізе, ідуць ветэраны-партызаны ў ліпені 1969 года на Дзень вызвалення Слоніма ад гітлераўцаў. Дарэчы, менавіта ў той год у горадзе і быў адкрыты помнік-танк.



АФІЦЫЙНА

Едва сводят «концы с концами»

Ученые научно-исследовательского экономического института Министерства экономики Беларуси опросили 1200 граждан республики с целью выяснить их материальное положение.

Результаты исследования показали следующее: 44% опрошенных «едва удается сводить концы с концами», 5% респондентов сообщили, что «залезли в долги», а 7% «вынуждены использовать свои сбережения». Вместе с тем, каждый третий опрошенный (32%) «немного откладывает», 2% — откладывают «много» денег. Остальные респонденты (10%) затруднились ответить на предложенный вопрос.

БелаПАН

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Пачалася падпіска на «Газету Слонімскую» на _другое паўгоддзе_ 1998 года. Па падпісцы наша газета будзе каштаваць танней, чым у розніцу.


Выпісвайце і чытайце «Газету Слонімскую»!

АКТУАЛЬНА

Колькі каштуе пасадзіць бульбачку?

Неяк я разгаварыўся са знаёмым калгаснікам Іванам К. Тэму гаворкі закранулі балючую, гарачую, як і цяперашняя веснавая пара – пасадка бульбы.

–Сёлета я пасаджу сорак пяць сотак. Для гэтага мне спатрэбіцца прыблізна 700 кілаграмаў бульбы. У калгасе я выпісаў адну тону, бо трэба нешта ж есці. За ўсё заплачу чатыры мільёны рублёў, – сказаў знаёмы.



Рэч у тым, што ў мінулым годзе ў многіх вяскоўцаў не ўрадзіла бульба. Некаторыя накапалі столькі ж, колькі пасадзілі. Таму людзі вымушаны звяртацца да свайго старшыні калгаса, каб выпісаць бульбы для пасадкі. Не, я не хачу папракаць старшынь калгасаў. Маўляў, абдзіраюць бедалагу-калгасніка, беручы грошы за бульбу. Вядома, за ўсё трэба плаціць.

Майму знаёмаму калгасніку яшчэ пашанцавала. Яму ўдалося выпісаць бульбы, а многім яе не хапіла. Людзі узбуджаныя, незадаволеныя, нават сварацца адзін з адным. Вясковае начальства нервуецца.

–Божа! Да чаго ж мы дажыліся! – думаю я. – Па радыё, па тэлебачанні, у газетах трубяць пра дасягнутыя поспехі, пра нейкі эканамічны цуд, а калгасніку ноччу не спіцца, усё думаецца, як пасадзіць бульбу.

–За пасадку і апрацоўку бульбы я, відаць, заплачу яшчэ 150 тысяч рублёў, – працягвае гутарку Іван К. – Магчыма, нават больш. Бо, каб выкапаць бульбу, аддам яшчэ каля паўтара мільёна рублёў: што на транспарт, што на закуску, што на гарэлку. Вось і лічы. Больш пяці мільёнаў будзе каштаваць мне бульбачка. А мая зарплата ў месяц – мільён дзвесце тысяч. Выходзіць, пяць месяцаў ад пасадкі да капання я буду працаваць толькі на бульбу. А яшчэ невядома, ці ўродзіць яна?

Я прыкідваю: колькі мне, настаўніку, каштавала б яна, калі б, напрыклад, вырашыў пасадзіць дзесяць сотак бульбы?

У калгасе насенне мне не выпішуць. Прыйдзецца ісці на рынак. Там за дзесяць кілаграмаў прыдзецца заплаціць тысяч шэсцьдзесят плюс за тое, каб прывезці бульбу на поле. Затым у калгасе трэба выпісаць чатыры тоны гною па восемдзесят тысяч рублёў за тону. Яшчэ на 320 тысяч палягчэе кішэня. Трактарыст за пасадку возьме 250 тысяч. Потым яе трэба будзе апрацаваць – за сотку заплачу 20 тысяч, не меней. Карацей, мне расхацелася саджаць бульбу.



Успамінаю пасляваенныя пяцідзесятыя гады. Я тады быў малы, але добра адклалася ў памяці, як аднавяскоўцы ў калгасе працавалі амаль што за дарма, за славутыя працадні. У сярэдневяковым Рыме рабоў хоць кармілі, а калгаснік мусіць яшчэ думаць, як зарабіць на хлеб.

Аляксей ЯКІМОВІЧ, в. Касцяні

ЗДАРЭННІ

Палёт з шостага паверха

43-гадовы жыхар Слоніма Павел Карней упаў з шостага паверха і абыйшоўся лёгкім пашкоджаннем правай рукі.

Незапланаваны палёт здарыўся ў мінулую нядзелю на Шасейнай вуліцы. Павел прыйшоў у госці да свайго сябрука, які жыве ў 9-павярховым доме. Як звычайна, выпілі, закусілі і выйшлі на пляцоўку пакурыць. Аднак дзверы зачыніліся, а ключы засталіся ў кватэры. Карней, як былы верхалаз, паспрабаў патрапіць у кватэру праз балкон суседа, але сарваўся і паляцеў уніз. На шчасце прызямліўся прама на клумбу.

Анатоль МІРСКІ

ЦИТАТА НОМЕРА

НАЗАД, В СВЕТЛОЕ БУДУЩЕЕ

"К 2001 году мы должны достичь уровня развития нашего государства советских времен по основным показателям ..."

(Из выступления председателя горисполкома Олега Лактюшина на праздничном митинге 1 мая 1998 г.)

СКАНДАЛ

Рамонт з парушэннямі

Галоўны ўрач раённай бальніцы Аляксандр Гулінскі атрымаў папярэджанне і быў пазбаўлены прэміяльных даплат за красавік бягучага года на 30%.

Такое рашэнне яму вынес гарадскі выканкам на апошнім паседжанні, дзе падводзіліся вынікі праверкі правільнасці і эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў на рамонт бальніцы.

Высвятляецца, што ў мінулым годзе на капітальны і бягучы рамонты медыцынскіх устаноў было выдзелена 1 мільярд 35 мільёнаў рублёў, а выкарыстана 1 мільярд 33,6 мільёна рублёў. Пры гэтым, слонімская МПМК-163 падчас рамонту дзіцячага аддзялення, бухгалтэрыі, аптэкі і іншых памяшканняў завысіла аб'ёмы выкананых работ па ўкладванню лінолеуму і наклейванню шпалераў. У выніку будаўнікі атрымалі ад медыкаў лішніх 15,8 мільёна рублёў. Акрамя гэтага зафіксаваны выпадкі спісвання матэрыялаў звыш нормы. Кіраўнікам МПМК-163 Станіславу Кубіку і фірмы "Сервіс" Валянціну Сяргейчыку загадана незаконна атрыманыя бюджэтныя грошы вярнуць дзяржаве да 15 траўня.

Міхась АКУЛКА

Колькі ў школах едакоў?

У дзесяці школьных сталовых горада сёння харчуецца 9194 вучні.

За кошт датацыі і бацькоўскай даплаты харчаванне атрымліваюць 37% дзяцей, а за кошт толькі датацыі – 63%. За кошт сродкаў бюджэту харчуецца ажно 178 навучэнцаў.

Міхась АКУЛКА

ФУТБОЛ *высшая лига 4-й тур*

ДВА РАЗНЫХ ТАЙМА

Коммунальник (Слоним) — Шахтер (Солигорск) — 0:0

Слоним. 4 мая. Стадион «Юность». 3000 зрителей. Судья Владимир Дик (нк, Минск).

Коммунальник: Киркиж, Капанец, Шупилов (Колядчик, 77), А.Дегиль, Дым (В.Дегиль, 63), Феоктистов (Киреня, 85), Пашкевич, Савицкий, Баль, Цыбулько, Татарашвили.

Предупреждение — Лукин (Шахтер).

Конкурс "ГС" и ООО "Телкон": лучший игрок — Киркиж, бомбардир — Татарашвили, лучший новичок — Феоктистов.

Два совершенно разных тайма слонимские болельщики увидели в понедельник. Если окончания первой половины игры они ждали с нетерпением, потому что "Коммунальник" едва отбивался от атак гостей, то в конце второго тайма, наоборот, так быстро текли минуты, что наши забить гол так и не смогли.

(Продолжение на 5-й стр.)

ПРАБЛЕМА

ТРЫЛЬЁНЫ НА ДАРОГАХ НЕ ВАЛЯЮЦЦА

3-за дрэннага стану аўтамабільных дарог беларуская эканоміка штогод губляе больш чым 22 трыльёны рублёў, што складае амаль сем працэнтаў валавага ўнутранага прадукта. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Генадзь Навіцкі.

Па яго словах, за апошнія пяць гадоў парк аўтатранспартных сродкаў у Беларусі ўзрос больш чым у два разы. На фоне адчувальна ўзрослай інтэнсіўнасці руху асабліва павялічыўся аб'ём перавозак грузаў цяжкімі машынамі, перш за ўсё ў міжнародных зносінах. Высокая нагрузка на дарогі і недастатковае фінансаванне для падтрымкі іх на належным узроўні прывялі да таго, што больш за 24 тысячы кіламетраў дарог рэспублікі (агульная працягласць якой складае 52 тысячы кіламетраў) знаходзяцца, як адзначыў Г. Навіцкі, у незадавальняючым стане.

У сувязі з гэтым, Камітэт па аўтамабільных дарогах пры Міністэрстве транспарту і камунікацый распрацаваў дзяржаўную праграму. Для яе рэалізацыі неабходна штогод выдзяляць 33 трыльёны рублёў, тады як у 1998 годзе запланавана фінансаванне ў аб'ёме ўсяго 11 трыльёнаў.

Па словах начальніка Слонімскага дарожнага ўчастка №7 Сяргея Мазаніка, ДУ абслугоўвае 136 кіламетраў аўтамабільных дарог, 19 мастоў, 8 стаянак аўтатранспарту, 34 аўтапавільёны і 80 аўтобусных прыпынкаў.

Адзін з асноўных паказчыкаў работы ўчастка — колькасць дарожна-транспартных здарэнняў на абслугоўваемых магістралях па віне дарожнікаў. На сумленні работнікаў такіх здарэнняў няма. Тым не менш дарожнае пакрыццё за апошні час прыкметна сапсавалася.

—Таму, — адзначае Сяргей Міхайлавіч, — сёлета неабходна капітальна адрамантаваць 8 кіламетраў аўтадарогі Ваўкавыск-Баранавічы ў раёне вёскі Чамяры, а таксама пакласці ад вёскі Новая Стража да паста ДАІ асфальт. Акрамя гэтага, трэба адрамантаваць мост у г.п. Зэльве праз раку Зяльвянку і мост праз Шчару ля аўтарамонтнага завода. Вядома, што для выканання гэтых работ патрэбны вялікія грошы, а іх увесь час не хапае. Колькі нам будзе на самой справе выдзелена сродкаў, пакуль што невядома. А аднаго жадання зрабіць дарогі лепшымі, мала. З-за недахопу сродкаў, — гаворыць ён, — стан аўтамабільных дарог паступова становіцца ўсё горшым. Тэрмін службы асфальтавага пакрыцця дарог да першага рамонту замест 18-20 гадоў складае ў нас усяго 6-7 гадоў. Якая эканоміка, скажыце, вытрымае такую нагрузку? А колькасць транспарту на нашых дарогах штогод павялічваецца, асабліва шматгрузнага. Напэўна, многія слонімскія вадзіцелі заўважылі на асобных участках магістраляў каляіны, і іх з кожным годам становіцца ўсё больш.

Калі ў 1993 годзе ДУ адрамантавала 45 км дарог, то летась усяго 17 км.

На ўчастках нашых аўтатрас налічваецца 1057 дарожных знакаў, а многія з іх трэба мяняць на новыя. Адзін такі знак каштуе 20 даляраў. Падобная сітуацыя з аднаўленнем тэхнікі. За апошнія пяць гадоў змаглі набыць толькі два трактары "Беларусь". Існуе праблема якасці асфальтабетону і шчэбеню. Таму і вырашыла ДУ выдаткаваць пэўную частку сродкаў на ўстаноўку для абяспыльвання шчэбеню, якую зрабілі сваімі сіламі.

Да таго ж, на бітумбазе, якая размешчана непадалёку ад вёскі Паўлава, работнікі ДУ навучыліся выраблядь літы асфальтабетон, які па якасці ў некалькі разоў пераўзыходзіць звычайны асфальт.

У выніку, дзякуючы гэтым навінкам, адрамантаванае палатно за зіму не разбурылася, і камісія па агляду дарог адзначыла добры стан магістраляў, якія абслугоўвае Слонімскі дарожны ўчастак №7.

Валянцін ЧУРЫЛА

Государство гарантирует

По официальным данным, на руках у населения Беларуси находится свыше 2 млрд. долларов. В связи с этим президент Лукашенко выдал декрет о некоторых мерах по обеспечению сохранности валюты физических и юридических лиц, которые доверят свои доллары банкам. Смысл декрета в том, что на сей раз само государство берет ответственность за валютные вклады, гарантируя, что конвертация долларов не произойдет.

Со дня выхода документа прошло более 2-х недель. "Поплыла" ли валюта в слонимские банки? Об этом наш корреспондент попытался узнать у руководства банков.

Алексей Матач, исполняющий обязанности управляющего АО "Приорбанк":

—Уже полгода наш банк с валютными вкладами физических лиц не работает, хотя такая возможность в дальнейшем не исключена. После выхода декрета было много звонков от населения. В основном, звонили пожилые люди, которые намеревались доверить нам от 100 до 300 долларов.

Мария Рожнова, управляющая отделением "Белагро-промбанка":

—С декретом мы ознакомились, однако никаких разъяснений нам пока не поступало. Наш банк уже полтора года таких вкладов не принимает. Раньше, когда мы работали с валютой физических лиц, то её в банк несли в основном пенсионеры. Суммы были по 200 и более долларов.

Владимир Малашицкий, главный бухгалтер слонимского отделения "Белпромстройбанка":

—До этого декрета наш банк не работал с валютными вкладами физических лиц. Сейчас думаем заняться этим видом деятельности. Честно говоря, я сомневаюсь, что люди активно понесут свои деньги в банк, хотя гарантом сохранности вложенных средств выступило государство.

Ольга Крупник, заместитель директора слонимского отделения "Беларусбанка":

—Трудно сказать, понесут ли люди деньги в банк потом, но сейчас активной волны поступлений не наблюдается. Мне кажется потому, что "заработать" на этом невозможно много. Если пару лет назад ставка предлагалась до 32% годовых, то сейчас она составляет 7-11%. Так же, по-моему, люди боятся, что завтра их заставят декларировать суммы, внесённые во вклад. То есть принесут вкладчики валюту, а их потом налог с той суммы заставят платить.

СТАТИСТИКА

Как мы живем

Александр СОСНОВ,
кандидат экономических наук

Выясняется, что среднемесячная заработная плата в 1997 году пересчитанная в долларах США по официальному курсу, снизилась на 6,3% (таблица 1). А в январе текущего года по сравнению с декабрем прошлого года она уменьшилась на 10%.

Таблица 1

Среднемесячная номинальная зарплата	1996	1997
В текущих ценах, тыс. руб.	1212,2	2262,4
В USD по курсу Нацбанка	90,3	84,6

Расчеты показывают, что уровень заработной платы, исчисленный в долларовом эквиваленте по отраслям, практически повсеместно снижался (таб.2). Исключение составили только промышленность, строительство и банковская деятельность. Наиболее существенно заработная плата упала в жилищно-коммунальном хозяйстве, связи, сельском хозяйстве, здравоохранении и в сфере культуры (более чем на 10%).

В абсолютном размере особенно низка заработная плата в органах социального обеспечения — 55,7% от средней по стране, сельском хозяйстве — 57,6%, искусстве — 69,7%, культуре — 70,15%.

Еще хуже положение пенсионеров, поскольку среднемесячная пенсия в долларовом эквиваленте снизилась на 13,4% (таб. 3). При этом ухудшается соотношение заработной платы и пенсий: если в 1996 году средняя пенсия составляла 40,7% средней заработной платы, то в 1997 году только 37,6%.

Таблица 2

Среднемесячная зарплата по отраслям (рублей)	в текущих ценах		в USD	
	1996	1997	1996	1997
Экономика в целом	1212,2	2262.4	90,3	84,6
Сфера материального производства	1209,3	2292,7	90,0	85,8
в том числе:				
промышленность	1366,4	2737.3	101,7	102,4
сельское хозяйство	757,7	1301.5	56,4	48,7
транспорт	1462,6	2622,1	108,9	98,1
связь	1351,5	2304,5	100,6	86,2
строительство	1474,2	2979,7	109,8	111,5
торговля и общественное питание	1070,3	1956,8	79,7	73,2
маттехснаб и сбыт	1594,6	2969,2	118,7	111,1
жилкоммунхоз	1261,8	2144,4	94,0	80,2
здравоохранение	1117,6	1944,9	83,2	72,8
социальное обеспечение	682,3	1258,8	50,8	47,1
образование	1015,4	1854,2	75,6	69,4
культура	893,3	1585,6	66,5	59,3
искусство	859,1	1576,5	64,0	59,0
наука и научное обслуживание	1353.9	2619,3	100,8	98,0
банки	2309,5	4615,6	172,0	172,7
страхование	1210,8	1800.4	90,2	67,3
управление	1700,6	3288,9	126,6	123,0
в том числе:				
аппарат органов госуправления	1718,7	3227,4	128,0	120,7
судебные и юридические учреждения	1911,1	3378,8	142,3	126,4

Таблица 3

Среднемесячная пенсия с учетом компенсаций	1996	1997
В текущих ценах, тыс. руб.	493,0	850,5
В USD по курсу Нацбанка	36,7	31,8

При этом расчеты показывают, что официальные данные не отражают реального положения вещей. Так, если перевести официальный среднегодовой минимальный потребительский бюджет в те же доллары США, то вместо его роста, хотя бы из-за инфляции самого доллара, происходит снижение (таб.4), что свидетельствует либо о неточности официальных данных, либо о сознательном их искажении.

Таблица 4

Размер минимального потребительского бюджета	1996	1997
В текущих ценах, тыс. руб.	1098,7	1835,2
В USD по курсу Нацбанка	81,8	68,7

В Беларуси продолжает снижаться рождаемость — с 9,3% в среднем в 1996 году до 8,8% в 1997 году, увеличивается смертность — с 13,0% до 13,4% соответственно. В результате общая численность населения страны в настоящее время составляет 10,2 миллиона человек и является самой низкой с 1990 года. Продолжает уменьшаться численность молодежи и возрастать число пенсионеров. Снижается продолжительность жизни населения.

Таким образом, за 1997 год качество жизни населения РБ продолжает падать, и изменения этой тенденции не ожидается. Основной причиной этого является отсутствие экономических реформ, а для их проведения необходима политическая воля и элементарный профессионализм.

БелаПАН

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК.

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5. Тэл. 2-14-39.
E-MAIL:gs@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 7 траўня 1998 г.
Час падпісання 8:00.
Надрукавана ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

Падпісны індэкс 64042.
Наклад 6.600 экз.
Заказ № 1488.

«ГС» **Наш опрос**

1 мая — это праздник или...

...возможность отдохнуть от повседневных забот? С таким вопросом корреспондент "ГС" в этот день обратилась к слонимчанам, которые отдыхали в городском парке.

Пожилые люди, пенсионеры:

–Для нас он как был праздник, так и остался. Это радостный и незабываемый день! Мы выросли с этим праздником. Только, к сожалению, многие наши ровесники уже умерли. Видите, как сегодня мало в парке людей, не то, что было раньше. Многие уже не считают этот день праздником. Если бы все были такие как мы, то здесь было бы море людей.



Ученицы старших классов:

–К этому празднику мы никак не относимся. 1 мая – просто замечательный выходной день, когда можно прийти в парк и просто повеселиться, пообщаться с людьми.

Бухгалтер коммерческой фирмы:

–Для меня 1 мая – праздник только до обеда: есть возможность сходить на рынок. А после обеда – уборка дома, огород, дачный участок и прочее.

Молодой человек:

–Для меня 1 мая ассоциируется с чем-то светлым, прекрасным. Мне хотелось бы, чтобы у нас было побольше таких праздников.

Семейная пара с ребенком:

–Это конечно же и праздник, и возможность отдохнуть. Мы – то поколение, для которого 1 мая все еще праздник труда.

Продавец магазина "Спутник":



–Для меня это возможность отдохнуть, сходить с ребенком в парк, повеселиться. Я сегодня на работе, но все равно этот день радостный. Люди приходят, отдыхают и мы, конечно, стараемся обслужить их как можно лучше. Я думаю, что такие праздники должны быть, чтобы люди могли получить разрядку.

Учительница СШ №3:

–Для меня и не день труда, и не день отдыха, а намного больше. Я думаю, что этот праздник начнет приобретать более широкое значение: значение единства и солидарности людей, которые смогли почувствовать себя частичкой большого коллектива – землян.

Компания молодых людей:

–Конечно праздник. Есть повод выпить, повеселиться, познакомиться с симпатичными девчонками.

Опросила Елена СИНЯК


ГОРОД **Наши люди**

"Я возчик, и это здорово"

Наверное, многие слонимчане часто видят на центральных улицах города зеленый фургон с надписью "Продукты", в который запряжена лошадка. Управляет сивкой Владимир Бикрень, в прошлом механик завода железобетонных конструкций. Профессию поменять его заставила жизнь: попал под сокращение. Уже второй год он возит продукты в отделения старой больницы. Работа, конечно, не ахти какая: нужно самому ящики, коробки загрузить, самому разгрузить. С понедельника до пятницы продукты развозит он, а по выходным — машина "скорой помощи". Более того, гужевой транспорт медикам обходится дешевле, чем "железный" конь, работающий на бензине.



—Коня зовут Лысый, ему 6 лет, молодой еще. Понимаете, сам я из деревни, с детства имею дело с животными и очень их люблю. Может поэтому тут и работаю, — говорит Владимир. —Ведь кроме того, что с Лысым продукты развозим, так еще и разные сельхозработы под заказ выполняем: вспахать поле кому-нибудь, дровишек привезти.



Свой фургон Владимир оборудовал как "автомобиль": навесил зеркала, габариты и даже радиоприемник установил. На повозку он имеет техпаспорт и разрешение сан-эпидемстанции. Зимой или осенними вечерами включаются фары и указатели поворотов, которые помогают ему безаварийно ехать по улицам. Многие прохожие удивляются, что за транспорт такой движется по городу. А Владимир гордится своим оборудованием. Даже телевидение его фургон с лошадью снимало. Свою профессию менять на другую он пока не собирается.

—Она мне нравится. Я возчик, и это здорово! — на прощание сказал Владимир Бикрень.

Елена СИНЯК

ПЕДАГОГІКА

Набліжаецца рэформа школы

На школьных педсаветах горада цяпер стала актуальнай тэма рэформы агульнаадукацыйнай школы, якая павінна пачацца з наступнага навучальнага года. Асноўная мэта якой — развіваючае навучанне.

Так на педсавеце СШ №8 нядаўна разглядалася пытанне "Новыя падыходы да навучання ў пачатковай школе". Сэнс якіх – не толькі вучыць, але і выхоўваць; не толькі даваць веды, але і вучыць імі карыстацца; навучанне павінна выхоўваць свабодную асобу. Гэта ні ў каго не выклікала пярэчанняў.

А вось як навучыць чыстапісанню 6-гадовае дзіця за год, займаючыся па новай праграме тры разы на тыдзень па 35 хвілін – гэта для настаўнікаў пакуль застаецца загадкай. Бо той самы курс па старой праграме для сямігодак разлічаны на 6 урокаў па 45 хвілін у тыдзень, а вынікі часта застаюцца далёкімі ад жадаемых.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАШ КОНКУРС *А яшчэ быў такі выпадак...*

Мудры сват

—Каб ты смалы напіўся, гад гэтакі! — дапякала Лёніка ягоная жонка Анюта. — Зусім сумленне згубіў, лазіш па чужых хатах, нібы той жабрак!

Праклёны ліліся, мусіць, з паўгадзіны, але Лёнік маўчаў і цярпліва выслухоўваў Анюціны пацеры. Што зробіш — вінаваты акуратна. Учора вечарам прасядзеў на хрысцінах у цёткі Вераб'іхі. Піў, еў, спяваў, а калі прыйшла чарга абдорваць немаўлятка — збег з хаты, нібы злодзей.

Але асабліва на Лёніка ніхто не крыўдзіўся. Жыхары вёскі Пустабораў шмат гадоў ведалі яго, як аматара прыйсці на любую гулянку без запрашэння, каб падпіць, пад'есці і паціху збегчы...

І не сказаць, каб Лёнік надта быў жадны да гарэлкі, ці да ежы. Аднак ніводнае вясковае вяселле, ці проста гулянка без яго не абыходзіліся. І ўсе настолькі звыкліся з гэтым, што адразу пыталіся: што здарылася, калі яго не было на вяселлі.

Самае адметнае тое, што ніхто ніколі не заўважаў, як і калі Лёнік пранікаў у хату і садзіўся за стол. Рабіў ён гэта па-майстэрску.

Суседзі не адзін раз выгаворвалі Анюце крыўдныя заўвагі наконт нахабных учынкаў мужа, але яна толькі пускала слязу і раз-пораз апраўдвалася: куды ёй падзецца, калі ў хаце пяцёра дзяцей. Калі Лёніка выгнаць з хаты — хто іх будзе карміць? А так хоць які-ніякі, а гаспадар у хаце ёсць.

Мусіць Лёнік і надалей цягаўся б па хатах, калі б не выпадак, які назаўсёды адвучыў яго ад гэтай нахабнай звычкі.

Як раз на Сёмуху ў вёсцы было вяселле. Старшыня калгаса Рыгор Кадаўбанец аддаваў замуж сваю непрыгожую дачку-векавуху Марусю. Вяселле было гучным — на ўсю акругу. На гукі музыкі на веласіпедах з'ехалася моладзь з суседніх вёсак. Са Слоніма былі наняты лепшыя музыканты. А сватам на вяселлі быў не абы хто, а сам участковы Вінцэсь Палундра.

На другі дзень застолля, калі ўсе госці паціху расселіся за сталамі і пачалі наліваць чаркі, Лёнік, нібы цень, непрыкметна прашмыгнуў у хату і прымасціўся за сталом ля самых дзвярэй.

Ніхто не звярнуў увагі, акрамя свата, які добра ведаў Лёнікаву звычку, таму ён вырашыў дзейнічаць неадкладна.



Толькі Лёнік паспеў перакуліць першы кілішак, як на ўсю хату ў мікрафон прагучаў грымучы голас свата:

—Дарагія госці! Прыступім да абдорвання маладых. Што падорыць жаніху і нявесце наш паважаны госць Лёнік?

Ад такога раптоўнага пытання ў Лёніка аж сківіца адвісла: гэта ж трэба класці на талерку грошы, якіх у яго не было. Ён разгублена ўстаў, пераступіў з нагі на нogу і праз пару секунд прамямліў:

—Ды няма ў мяне ніякіх грошай.

Сват прадбачыў такі адказ і імгненна сказаў:

—Не бядуй, Лёнік! Я табе пазычу.

І адразу дастаў з кішэні дзесяць стотысячных купюр.

—Дарагія госці! — працягваў Вінцэсь. — Дарыце ўсе, так як Лёнік! Не пашкадуйце маладым па мільёну рублёў.

І лязгнуўшы кіем па бэльцы, дадаў:

—Няхай сам Гасподзь Бог будзе сведкам, як я выручыў з бяды нашага Лёніка.

Усе госці зайшліся ад рогату, а Лёнік, як ашпараны вылацеў з хаты. Дома ён расказаў Анюце пра тое, што адбылося. Колькі не кляла мужыка Анюта, а ўрэшце рэшт ёй прыйшлося раніцай несці ўчастковаму грошы.

Вінцэсь быў мудрым чалавекам і ўмомант даў кабеце адказ:

—А хіба я табе пазычыў гэты мільён? Няхай доўг аддае той, каму я пазычыў.

Анюта нехаця павалаклася дахаты. Дома ўляпіла Лёніку аплявуху, усунула яму мільён і загадала ісці да ўчастковага.

Праз хвілін пятнаццаць Лёнік, як жнівеньскі туман, прыплыў да Вінцэся Палундры і працягнуў яму руку з пакамечанымі купюрамі. Але ўчастковы і на гэты раз збіў з панталыку Лёніка.

—Я табе, браце, добрую справу зрабіў? Пазычыў грошай у такі адказны момант?

—Ну, пазычыў, — прамармытаў Лёнік.

—Ну, дык значыць з цябе бутэлька! — і Палундра зарагатаў на ўвесь падворак.

Мільён рублёў з Лёніка Вінцэсь спагнаў, а вось бутэльку чакае да гэтага часу.

Аднак з тае пары прайшло нямала часу, а Лёнікаву звычку — хадзіць на гулянкі без запрашэння — як рукой зняло.

Валянцін ЧУРЫЛА

ШЛЯХ ДА БОГА

Тайна Святого креста

Пожалуй, ни один из шедевров древнебелорусского искусства не имеет такой таинственной и драматической судьбы, как крест Ефросинии Полоцкой, изготовленный в 1116 году знаменитым полоцким мастером Лазарем Богшей.

Символ христиан

Ценность креста Ефросинии Полоцкой не столько в злате и серебре, жемчугах и драгоценных камнях, коими украсил свой шедевр великий мастер, сколько в его святости. Он и замышлялся внучкой князя Всеслава Полоцкого, завоевавшего некогда киевский великокняжеский престол, как символ прекращения междоусобных раздоров. Да и сама Ефросиния, имя которой стоит в ряду известных белорусских просветительниц, постриглась в монахини 12 лет отроду, потому что не могла смириться с дикими отношениями вражды и раздора в княжеских семьях.

Этим ефросиньевским мотивом — единения людей в минуту лихой годины — и руководствовался Лазарь Богша, когда закладывал в крест частичку древа Креста Господня, кусочек камня от гроба Богородицы, частицы мощей святых. Впрочем, мастер прекрасно понимал слабости человеческие. Поэтому и предупреждал: "...Кто же осмелится на такое (вынести, продать или отдать крест из полоцкого Софийского собора)... либо князь, либо епископ, либо игуменья, либо другой какой человек, да будет на нем это проклятие".

Блеск злата, однако, оказывался сильнее заклятия. Завоевав Полоцк, смоленский князь вывез в XII веке реликвию в Смоленск. Спустя 400 лет Смоленск завоевал великий князь Василий III и вывез его в Москву. Набожный Иван Грозный, прочитав заклятие, дал обет, что в случае, если завоюет Полоцк, который к тому времени находился под литовскими князьями, возложит крест на Богом уготованное место. Так оно и произошло. Позже верующие сберегли крест от поляков, завоевавших Полоцк в 1579 году. А во время нашествия Наполеона монахи замуровали его в стенах храма.

За крест бились католики и иезуиты. Его завоевывали в междоусобных схватках древнерусские князья. Не попал он в руки польскому королю Стефану Баторию и Наполеону... И лишь Октябрьская революция наложила на него свою руку. Впервые за свою многовековую историю святая реликвия таинственно пропала.


Следы теряются на Востоке

Однако то, что в течение 800 лет не смогли сделать захватчики, в одночасье свершили большевики. После Октябрьской революции началась новая история креста. Реликвия всего христианского мира стала экспонатом заурядных финотделов, пыльных музейных запасников, кабинетов энкавэдэшников, пока перед самой войной не оказалась в бронированной комнате-сейфе Могилевского обкома партии. В Могилев, который в те годы должен был стать столицей Беларуси, и свозились ценности, награбленные в церквах республики.

Но началась война, и крест исчез.

Однако навсегда ли он утерян? На этот вопрос помимо историков и искусствоведов вот уже шесть лет пытаются ответить и белорусские чекисты. По мнению одного из сотрудников могилевского управления КГБ Беларуси Сергея Богдановича, следы уникального творения теряются не на Западе, как считалось в послевоенные годы, а на Востоке — в России.

Несколько лет назад в КГБ Беларуси была создана специальная группа, которая серьезно занялась расследованием. Уже первые результаты поисков говорят о том, что на Запад крест не попал. В фашистских архивах Розенберга, которые



составлялись с педантичной дотошностью, следы реликвии найдены не были. Ни с чем вернулась из США и белорусская экспедиция искусствоведов, которая пыталась отыскать следы креста в частных коллекциях, в том числе и в коллекции Моргана, где, как долгое время считалось, и покоится реликвия. Ничего конкретного не сказал о ней и Интерпол. Сокровища будто сквозь землю провалились.

Все это красноречиво подсказывало Богдановичу необходимость изменить направление поиска. Недавно его мысли нашли неожиданное подтверждение. На одну из публикаций Сергея неожиданно откликнулся человек, который лично вывозил сокровища из Могилева в ... Москву. А пассажиром в его полуторке был не кто иной, как первый секретарь ЦК КП Беларуси Пантелеймон Пономаренко.

Как увозили крест из Беларуси

...В тот же день, 13 июля 1941 года, красноармейца Петра Поддубского вызвал военный комендант Могилева Воеводин и сообщил, что ему предстоит вывозить ценный груз из обкома партии. Во время погрузки, которая проходила под охраной шести сотрудников НКГБ во главе с майором, Поддубский слышал, как они восхищались великолепием креста. Позже у городского банка к полуторке присоединилось еще два автомобиля с деньгами, и колонна под непрерывными бомбежками, двинулась через Горки, Смоленск, Можайск на Москву. "Ценности надо довезти во что бы то не стало", — не раз повторял в дороге Пономаренко. Через двое суток машина затормозила у здания управления кадров Красной Армии, которое располагалось на Ленинских горах.

Показания Поддубского, которые, кстати, косвенно подтверждаются и в воспоминаниях Пономаренко и Воеводина, интересны еще и тем, что в них, пожалуй, впервые, всплыл ранее не подтверждавшийся факт участия в этом запутанном деле НКГБ. Как считает Богданович, крест в конечном итоге вполне мог попасть в частную коллекцию самого Берия — большого любителя старины. И такой вариант исключать нельзя: уж больно тщательно "замыли" органы свое участие в этом деле.

Не исключено также, что крест оказался в фонде "золота партии". Вполне возможно, что после прибытия в Москву он попал в Государственный Эрмитаж, или в музейные запасники Уфы, Саратова, Ярославля, куда во время войны эвакуировались архивы из Беларуси.

А недавно случилось событие, которое, возможно, прольет наконец-то свет на тайну креста: в криминальной передаче одного из телеканалов России в числе изъятых у преступников ценностей промелькнул предмет из того самого сейфа, который бесследно исчез в 1941 году. ФСБ России, которая согласилась оказывать коллегам из Беларуси всемерную помощь, уже ведет расследование.

"Благодать Божия сошла"

Накануне Нового года и Рождества Христова крест Ефросинии Полоцкой вновь обрел свою историческую родину, копия святыни, на воссоздание которой брестский художник Николай Кузьмич потратил пять лет, возложена в церковь Святой Ефросинии в Полоцке. В этом много символичного. Идея креста — согласие, мир — и сегодня, спустя восемь веков, волнует сердца верующих.

Рассказывают, что во время службы по случаю закладки в копию креста мощей святых людей, присутствовавших в соборе, вдруг начало "бить током". На что митрополит Минский и Слуцкий Филарет заметил: "Благодать Божия сошла". А художнику Николаю Кузьмичу показалось, что присутствовала при том таинстве сама Ефросиния...

"Российская газета"

Незвычайная гісторыя Жыровіч

Свята іконы Маці Божай Жыровіцкай каталікамі адзначаецца 7 траўня, а вернікамі праваслаўнай канфесіі — 20 траўня.

Назва Жыровічы паходзіць ад слова "жыр" альбо "жэр", што ў даўнія часы азначала тлушч, ежа. Сапраўды, Жыровічы здаўна мелі славу багатых угоддзяў.

У свой час Вялікі князь Літоўскі Казімір Ягелончык (1440-1492г.г.) перадаў вялікі абшар жыровіцкай зямлі літоўскаму падскарбію Аляксандру Солтану. На месцы Жыровічаў у той час з трох бакоў была пушча, з чацвёртага — вялікія лугі. Гэтыя бязлюдныя мясціны набылі вядомасць у 1470 годзе, калі тут адбыўся цуд. Пастушкі, якія пасвілі ў лесе жывёлу, аднойчы заўважылі на дзікай грушцы нейкую рэч, ад якой ва ўсе бакі разыходзіліся праменні. Самы адважны пастушок Пётр залез на дрэва і знайшоў там маленькі абразок, які ззяў незвычайным бляскам. Хлопчык забраў яго і прынёс да свайго пана. Солтан быў узрушаны апавяданнем хлопчыка, старанна загарнуў абразок у палатно і схаваў у куфэрак. На наступны дзень Солтан паведаміў гасцям аб гэтай знаходцы, а калі хацеў паказаць яе, то ўбачыў, што, хоць куфэрак быў замкнуты, самога абразка не было. "Не людская гэта справа, — сказаў ён, — а Божая". Солтан быў яшчэ больш здзіўлены, калі праз нейкі час пастушкі зноў прынеслі яму абразок, знойдзены на грушцы. Тады Солтан узяў абразок, сеў на каня і паехаў у пушчу, дзе здарыўся цуд. Лес быў густы, таму ён быў вымушаны далей ісці пешшу. Дайшоўшы да грушы, Солтан трапіў у непрытомнасць, у якой быў некалькі гадзін, а калі зноў прыйшоў у свядомасць, паведаміў людзям, якія яго знайшлі, што чуў Божы голас, які загадаў пабудаваць на тым месцы святыню. Потым высеклі лес вакол грушкі і ўзвялі драўляны храм, у якім быў змешчаны цудоўны абразок. Пад клапатлівай апекаю Аляксандра Солтана Жыровічы сталі хутка развівацца, а слава цудоўнага абразка прыцягвала сюды вялікую колькасць набожнага люду. Праз некалькі дзесяткаў гадоў пасля з'яўлення цудоўнага абразка адбыўся ў Жыровічах новы цуд, які сведчыць пра вялікую Божую моц.

Аднаго разу ноччу драўляная святыня на вачах жыхароў Жыровічаў згарэла імгненна. Пра выратаванне абразка не магло быць і гаворкі. Пасля чаго людзям здавалася, што ў іх аднялі найвялікшы скарб. Але праз час дзятва, якая гуляла каля папялішча, заўважыла панну незвычайнай прыгажосці, ад якой зыходзілі ясныя праменні. Яна сядзела на камяні. Перапалоханыя хлопцы пабеглі да святароў і паведамілі аб убачаным. Калі святары пайшлі да таго месца, то панны не знайшлі, аднак убачылі на камяні абразок, перад якім гарэла свечка. Яны з радасцю перанеслі цудоўны абразок у драўляную каплічку. З таго часу зноў пачала пашырацца слава Жыровічаў.

Але надыйшоў перыяд рэлігійнага разладу, які з асаблівай сілаю праявіўся ў другой палове XVI стагоддзя. Нашчадкі Солтанаў ігнаравалі культ



Багародзіцы і трымалі святыню толькі таму, што яна была для іх крыніцай даходаў. Ахвяраванні вернікаў часта ішлі на мэты далёка не шляхетныя. Распачатая маршалкам Янам Солтанам будова мураванай святыні была спынена на доўгія гады, ажно да 1613 года. У той час слонімскім старостам быў слаўны канцлер Леў Сапега. Тагачасны ўладальнік Жыровічаў Ян Мялешка быў шчырым вернікам. Ён узвёў у Жыровічах вельмі прыгожую мураваную святыню, пабудаваў кляштар і запрасіў у Жыровічы ордэн базыльянаў (Св. Базыля Вялікага).

Леў Сапега ахвяраваў свае землі і даў грошы на будаўніцтва храма. Менавіта з таго часу і распачынаецца гісторыя Жыровічаў, якая здабыла ім нябывалую славу. У значнай меры гэтаму садзейнічала ахвярная праца базыльянаў. Першым прэорам кляштару быў вядомы пазней святы мучанік Юзэфат Кунцэвіч. Святы Юзэфат і яго паслядоўнікі свядома імкнуліся да стварэння ў Жыровічах цэнтра адзінства хрысціян.

Размешчаныя на мяжы Літвы, Русі і Кароны, Жыровічы маглі збіраць вернікаў, што ўслаўлялі Маці Божую, і стварылі адну вялікую хрысціянскую сям'ю. Набожная праца законнікаў сустракала прызнанне і падтрымку простага люду і шляхты. Шматлікія цудоўныя аздараўленні хворых і іншыя надзвычайныя цуды, якія адбываліся ў Жыровічах, прыцягвалі да святога месца тысячы людзей. Слава Жыровічаў пашыралася далёка за межы краю.

У 1652 годзе мястэчка атрымала ад караля Яна Казіміра Магдэбургскае права.

У 1655 годзе пад кіраўніцтвам атамана Залатарэнкі дваццацітысячная армія казакоў заняла Жыровічы, спаліла мястэчка, забіла амаль усіх людзей. Асабліва здзекваліся казакі над базыльянамі. Святыня была разбурана і знішчана. Толькі ў 1660 годзе для Жыровічаў пачалася лепшая будучыня: панавала адзіная вера, якая яднала дзве розныя хрысціянскія канфесіі. Каля Жыровічаў былі пасяленні татараў, якія з пашанай адносіліся да хрысціянства.

Вялікая слава Жыровічаў дайшла ажно да Рыма. Цудоўны абразок Маці Божай Жыровіцкай аб'яднаў наша мястэчка з Апостальскаю Сталіцаю. І пра гэта існуе свая прыгожая і дзіўная гісторыя.

Урачыстая каранацыя цудоўнага абразка адбылася ў 1730 годзе і праходзіла восем дзён з 19.09 па 26.09.

Айцы-базыльяне вялі дакладны падлік асоб, якія прычашчаліся тут. За час урачыстасці да Святой Камуніі прыступілі 69837 рыма-каталікоў, 70515 грэка-каталікоў, а ўсіх разам — 140352 асобы.

Шэсць трыумфальных брамаў было збудавана па дарозе са Слоніма. Каранацыю абразка праводзілі мітрапаліт Атаназы Шэптыцкі і два біскупы. Княгіня Ганна Сангушка ахвяравала дзве залатыя кароны, цудоўна выкананыя ў Рыме і аздобленыя каштоўнымі камянямі. У Рыме ж былі адліты памятныя медалі ў гонар такой незвычайнай урачыстасці.

Праз стагоддзе пасля ўрачыстай каранацыі цудоўнага абразка ў Жыровічах усё непазнавальна змянілася. Базыльянская школа была заменена на духоўную семінарыю. У 1839 годзе святыня і абразок Маці Божай Жыровіцкай царскім указам былі перададзены праваслаўным.

Адноўленая копія абразка Маці Божай Жыровіцкай знаходзіцца ў галоўным алтары касцёла Святога Андрэя. Каля цудоўнага абразка і цяпер нястомна моліцца люд Божы. І толькі аднаму Богу вядома, хто і колькі атрымлівае тут ласкаў.

айцец Вітольд ЖЭЛЬВЕТРА,
ксёндз-дэкан касцёла Святога Андрэя

НАШЕ ИНТЕРВЬЮ

Краковский семинар

Днями преподаватель Жировичского техникума Игорь Подгородецкий был в Кракове, где проходил международный семинар учителей истории. В его работе принимали участие представители из России, Украины, Прибалтийских стран, Беларуси, Венгрии и Румынии. От нашей республики присутствовало 4 человека, в том числе и Игорь Подгородецкий, который сегодня отвечает на вопросы нашего корреспондента.



Внутренний дворик Ягеллонского университета в Кракове

—Основной темой семинара была проблема преподавания истории в школе. В принципе, наши приемы и методы мало отличаются от польских. Но в технической оснащенности кабинетов они сильно выигрывают. Например, в каждом кабинете есть видеомагнитофон. А наличие большого запаса видеоматериала позволяет учителю, практически по любой теме, поставить учебный фильм на 15-20 минут и т.д. В школах имеются по несколько ксероксов. Каждый учитель быстро может размножить любой материал, чтобы с ним ознакомились дети. Мы посмотрели два таких урока в обычных школах. Чувствовалось, что обстановка во время занятий творческая, мажорная и демократичная. Нет у них никаких проблем с учебниками. По одному предмету существуют несколько пособий. Школьник имеет право выбора...

—Была ли какая-нибудь культурная программа для приглашенных?

—Да, мы посмотрели два спектакля и съездили на экскурсию в город Закопане.

—Что еще запомнилось из поездки?

—На центральном вокзале в Варшаве стал свидетелем демонстрации бездомных. В ней принимало участие 70-80 человек. Судя по раздаваемой листовке, в Варшаве около 6 тысяч бездомных. Люди протестовали против политики властей выселить их из территории вокзала. Они требовали строительства специальных домов для бездомных и других льгот, которые бы облегчили их существование.

—Как обстоит дело с пересечением границы? Ведь теперь действуют новые правила?

—Действительно, в Польшу сейчас стало ездить сложнее. Но участникам форума консульство в Гродно предоставило бесплатную визу. Кстати, в консульстве я разговорился с несколькими стариками. Они, ветераны польско-немецкой войны 1939 года, приехали из разных мест Беларуси за получением денежного пособия (40 долларов в квартал). Пособие выдается всем ветеранам, независимо от национальности. Возможно, где-нибудь в наших селах еще живут ветераны, которые ничего не слышавшие о подобной льготе. Если человек немощен, то за него приезжают получать по доверенности дети, внуки...

Вообще, граница живет своей особой жизнью. Движение челночников не прекращается: туда —спирт, сигареты, а назад разное: мануфактура, ширпотреб...

Наталья ФУРСОВА

ГАРТАЮЧЫ СТАРЫЯ ГАЗЕТЫ...

Сёння мы адкрываем новую рубрыку "Гартаючы старыя газеты...". У ёй чытачы змогуць азнаёміцца з гістарычнымі матэрыяламі пра жыццё Слонімшчыны, якія былі змешчаны ў беларускіх газетах на працягу гэтага стагоддзя.

Сяргей ЁРШ



Дабрачынныя справы

Павятовае места Слонім было пры адыходзе расейцаў спалена, а ўсе фабрыкі — зруйнаваны. У пачатку вайны ў горадзе было 30000 жыхароў, цяпер — толькі 13000. Чысло асоб, каторыя не маюць з чаго жыць, надта вялікае. Між імі першае месца займаюць сем'і расейскіх ваенных. Больш 300 сямей атрымліваюць месячны "паёк", на што ідзе 1600 рублёў штомесяц. Сем'і, усё дабро каторых знішчана, атрымалі дапамогі 1500 рублёў. Жонкі ваенных — 861 рубель. Народная сталоўка штодзень выдае болей тысячы абедаў па 5 капеек, і каля 500 раздае дарма. Сем'ям ваенных і бежанцам, якія пакінулі родныя куты, прадаецца хлеб па 5 капеек за фунт пры агульнай для ўсіх цане хлеба 10 капеек за фунт.

Homan (Гоман, Вільня), №15, 4 красавіка 1916 г.

Каштоўная знаходка

Нядаўна ў Слоніме знойдзены экзэмпляр добра захаванай рэлігійнай кнігі беларускіх мусульманаў "Аль-Кітаб". Рукапіс гэты мае каля 800 балонаў (старонак — **С.Ё.**), напісаны арабскім пісьмом, але на беларускай мове. Перапісаны ён быў, верагодна, у XVIII стагоддзі. Гэтая знаходка з'яўляецца вельмі каштоўнай, бо дае новы матэрыял для вывучэння старабеларускай мовы...

Новая дарога (Беласток), №29, 8 жніўня 1943 г.

Добры прыклад

Па ініцыятыве беларускіх колаў у Слоніме, з дапамогаю падпісных лістоў, праведзены збор сродкаў на закуп твораў беларускага мастацтва для музея. Ужо ў першыя дні было собрана дастаткова грошай, каб набыць некалькі абразоў і малюнкаў вядомага беларускага мастака сп.Карніцкага.

Новы шлях (Мінск), №23 (35), снежань 1943г.

8 ФУТБОЛ

высшая лига 4-й тур

ДВА РАЗНЫХ ТАЙМА







Вначале была равная игра. Опасных моментов было немного. Ну, а затем "Шахтер" захватывает инициативу в свои руки и прижимает наших к воротам. Атака за атакой накатывается на штрафную "Коммунальника".

На 21 минуте опасно пробивает штрафной удар Любчук, но Киркиж намертво берет мяч. Вскоре бьет Белаш, но вновь Киркиж был на высоте. Наши защитники много фолят – никак не мог "чисто" забрать мяч Цыбулько... На 27 минуте Пашкевич с Киркижем сами создали себе проблему – мяч попал к нападающему "Шахтера" Тихончуку, но он промахнулся с нескольких метров.

Притихли трибуны. Капанец снова нарушает правила у своей штрафной – Киркиж спасает ворота. Через несколько минут бьет в "девятку" Любчук, но и здесь наш вратарь был великолепен – отбил трудный мяч. "Шахтеру" в этот вечер не везло.

"Коммунальник" пришел в себя к концу первого тайма. Отошел назад Дым, который уже вторую игру пробует себя в нападении, но выглядит не очень уверенно. Слишком медленно начинали атаку наши защитники, и если удавалось что-то создать, то эти редкие моменты реализовывались бездарно. Был заметен разрыв между нападением и защитой слонимчан.

Во втором тайме "Коммунальник" преобразился. Произошло это, отчасти, благодаря неудачным заменам, которые произвел тренер гостей Иван Щекин. Он заменил на 57 минуте Журавского, который в первом тайме смотрелся просто здорово, конструируя игру "Шахтера". А чуть раньше вместо Белаша на поле вышел нападающий Лукин, который ничем себя не проявил, разве что заработал предупреждение. А вот Алексей Шубенок угадал с заменами во втором тайме, в частности, включив в игру Валентина Дегиля. Его фланговые проходы раз за разом терзали подуставшую оборону "Шахтера".

Игра выровнялась и "Коммунальник" моментами даже превосходил гостей. Несколько раз к воротам "Шахтера" прорывался Татарашвили, но нанести прицельный удар ему не удавалось, а прострелы хотя и были опасны, но логического завершения не имели. На 86 минуте Татарашвили пробил выше ворот, а затем упустил хороший момент Савицкий. Казалось, еще немного и фортуна улыбнется слонимчанам, но просвистел финальный свисток. Нулевая ничья. С одной стороны обидно, что не выиграли, а с другой – хорошо, что не проиграли...

Сергей ЁРШ

РЕЗУЛЬТАТЫ ОСТАЛЬНЫХ МАТЧЕЙ ТУРА:

Белшина – Днепр-Трансмаш	– 1:1
Молодечно – Локомотив-96	– 1:2
Динамо Мн – БАТЭ	– 2:0
Гомель – Динамо-93	– 1:2
Нафтан-Девон – Динамо Бр	– 1:3
Неман – Торпедо-Кадино	– 1:3
Славия – Торпедо Мн	– 0:2







"ВАШ ВРАТАРЬ СЫГРАЛ ПРЕКРАСНО..."

Слонимским болельщикам, наверное, запомнился главный тренер "Шахтера" Иван Щекин, очень импульсивный, энергичный человек. Он известен любителям футбола по многолетней тренерской работе в минском "Динамо". Сейчас же он намерен создать классную команду в Солигорске. Корреспондент "ГС" попросил его прокомментировать прошедший матч:

–Игра могла быть сделана уже в первом тайме, но наши нападающие безграмотно и неумело использовали стопроцентные моменты... Забивать нужно было!.. А ваш вратарь сыграл прекрасно.

Мне кажется, что в первом тайме мы просто не позволили "Коммунальнику" сыграть так, как он умеет. Или, скорее всего, слонимчане не готовы были к такому развитию событий... А во второй половине матча была равная игра. Правда, на ее ход не лучшим образом повлияли мои замены. Я посчитал, что ребята в первом тайме подустали. Хотелось освежить игру, а получилось наоборот...

Однако, все же есть справедливость, и во втором тайме мы не пропустили гол. В результате – ничья. Для хозяев – это лучший исход, а для нас немного обидно.


С.Ё.

ТУРНИРНАЯ ТАБЛИЦА

ПОСЛЕ 4-ГО ТУРА

		И	В	Н	П	М	0
1.	Динамо-93 (Минск)	4	3	1	0	11-2	10
